*І. Г. ЛУПАШКА*

# АСНОЎНЫЯ ТЭНДЭНЦЫІ КУЛЬТУРНА-АДУКАЦЫЙНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ БЕЛАРУСКІХ ЛІТАРАТУРНЫХ МУЗЕЯЎ НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ

*На падставе аналізу практычнай дзейнасці беларускіх літаратурных музеяў, вынікаў анкетавання сярод музейных супрацоўнікаў вызначаюцца асноўныя тэндэнцыі музейнай справы. Галоўны акцэнт робіцца на зменах у культурна-адукацыйнай і экспазіцыйнай дзейнасці літаратурных музеяў, паказаны ўплыў на развіццё асобных яе аспектаў сучасных інфармацыйных тэхналогій.*

У Рэспубліцы Беларусь дзейнічае разгалінаваная сетка музеяў розных профіляў, у якой літаратурныя музеі прадстаўлены сямю[1] музеямі і дванаццацю філіямі, што складае звыш 5 % сярод усіх музеяў краіны. У іх захоўваецца значная частка нацыянальнага музейнага фонду – каля 160 тыс. музейных прадметаў, штогод літаратурныя музеі наведваюць звыш 200 тыс. чалавек [6, с.80–82].

Літаратурны музей – поліфункцыянальная ўстанова, якая выконвае запатрабаваныя грамадствам функцыі. Сучаснае сацыякультурнае развіццё падштурхоўвае музеі да пошуку новых падыходаў у вырашэнні сваіх задач. Літаратурны музей, рэагуючы на мабільнасць і зменлівасць сучасных сацыякультурных працэсаў, пашырае свае функцыі, кірункі дзейнасці і формы працы, пераўтвараючыся ў адкрытую грамадству сістэму, якая аператыўна рэагуе на грамадскія запатрабаванні.

Сучасныя тэндэнцыі ў дзейнасці музеяў разглядаюцца ў працах расійскіх даследчыкаў А. М. Масцяніцы, А. А. Сундзіевай, Л. М. Шляхцінай, І. В. Чувілавай, Т. В. Галкінай, М. У. Барысавай і інш. Аналіз і класіфікацыя базавых формаў культурна-адукацыйнай дзейнасці з'яўляюцца прадметам даследавання Т. В. Галкінай. Пытанні спалучэння традыцыйных і інавацыйных метадаў і формаў работы музея разглядае М. У. Барысава. Аднак аўтарамі амаль не вылучаюцца адметнасці, характэрныя для розных профільных груп музеяў. Асобныя аспекты перспектыў развіцця музеяў разглядаюцца беларускімі музеязнаўцамі А. А. Гужалоўскім, А. Б. Сташкевіч, Н. С. Стрыбульскай і інш. Але праблема арганізацыі культурна-адукацыйнай дзейнасці беларускімі літаратурнымі музеямі ў сучаснай сацыякультурнай сітуацыі застаецца недастаткова вывучанай і ў гэтым плане, як паказвае музейная практыка, – актуальнай.

Аналіз дзейнасці музеяў паказвае, што сярод асноўных яе тэндэнцый на сучасным этапе асабліва яскрава праяўляецца культурна-адукацыйны кірунак. Адлюстраваннем гэтага працэсу стала пашырэнне разнастайных формаў – ад спецыфічных музейных да нетрадыцыйных для музея. Заўважым, што традыцыйныя формы культурна-адукацыйнай дзейнасці музеяў, такія, як экскурсія, лекцыя, літаратурная вечарына і іншыя, па-ранейшаму застаюцца запатрабаванымі, аднак паступова адаптуюцца згодна патрэбам сучаснага наведвальніка. Так, пры правядзенні экскурсій усё часцей выкарыстоўваюцца метады тэатралізацыі, гульнёвы, дыялогавы. Напрыклад, экскурсія па выставе «Спадарожнікі дзяцінства» ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры (далей – ДМГБЛ) праводзіцца з дапамогай лялькі – казачнага персанажа, ад імя якой ідзе аповед. Пры правядзенні экскурсій музейныя супрацоўнікі ў пераважнай большасці аддаюць перавагу дыялогаваму метаду.

Такая традыцыйная музейная форма, як лекцыя, таксама набывае новыя рысы, таму што ўсё часцей суправаджаецца не дэманстрацыяй музейных прадметаў, а мультымедыйнай прэзентацыяй. У якасці прыкладу разгледзім лекцыі, якія прапануе ДМГБЛ. З 14 лекцый, якія прапануе музей, 10 суправаджаюцца дэманстрацыяй

---

[1] Да іх адносяцца: Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры, Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы, Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа, Літаратурны музей Максіма Багдановіча, Літаратурны музей Петруся Броўкі, Дом-музей Адама Міцкевіча ў Навагрудку, Гродзенскі музей Максіма Багдановіча.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

электроннай прэзентацыі ці відэаступкі, дзве – ілюстрацыйным матэрыялам па тэме і толькі дзве – арыгінальнымі прадметамі з фондаў музея [4]. На наш погляд, гэтая тэндэнцыя з'яўляецца спрэчнай. З аднаго боку, выкарыстанне сучасных тэхналогій з'яўляецца станоўчым момантам, таму што падвышаецца вобразнасць лекцыі, паколькі ёсць магчымасць адначасова прадэманстраваць значна большую колькасць артэфактаў і тым самым наблізіцца да гістарычнай рэчаіснасці; таксама вырашаецца праблема захаванасці музейных прадметаў, якая ўзнікае пры іх транспарціроўцы і частай дэманстрацыі. З другога боку, з ужываннем электроннай прэзентацыі паступова губляецца «музейнасць» лекцыі, таму што асноўная адметнасць музейнай лекцыі менавіта ў тым, што на ёй насамрэч прысутнічае музейны прадмет. На сёння «музейнасць» лекцыі захоўваецца за кошт таго, што ў прэзентацыю ўключаюцца лічбавыя выявы музейных прадметаў з фондаў, якія не прадстаўлены ў шырокім доступе.

Вялікі культурна-адукацыйны патэнцыял літаратурнага музея абумоўлівае зварот да новых формаў работы з наведвальнікамі. Як вельмі перспектыўную форму можна назваць музейна-педагагічны занятак, які за апошні час укараніўся сярод іншых формаў культурна-адукацыйнай дзейнасці, прапануецца большасцю літаратурных музеяў і з цікавасцю ўспрымаецца наведвальнікамі. На сёння пераважная частка музейна-педагагічных заняткаў распрацоўваецца для малодшых школьнікаў, аднак, з ужываннем адпаведных метадаў, гэтая форма можа выкарыстоўвацца для розных узроставых катэгорый наведвальнікаў. Першыя спробы ў гэтым кірунку зрабіў Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы (далей – музей Янкі Купалы), які прапаноўвае вучням 5–7-х класаў музейна-педагагічны занятак «Рэч расказвае пра эпоху», а старэйшым школьнікам і студэнцкай моладзі – «Эстэтыка кахання» [3].

Сучасны музей актыўна развівае рэкрэацыйную дзейнасць, асаблівасць якой – у тэматычнай накіраванасці, вызначанай профілем музея. Працягваюцца пошукі па ўдасканаленні такіх досыць распаўсюджаных формаў, як прэзентацыя, літаратурная вечарына, сустрэча з цікавым чалавекам, музейнае свята і інш. З'явіліся ў музейнай дзейнасці і новыя формы, да прыкладу канцэрт, тэатралізаванае дзеянне. Гэтыя формы дастаткова шырока ўжываюць усе літаратурныя музеі. Напрыклад, у Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа (далей – музей Якуба Коласа) рэгулярна праводзяцца «літаратурныя чацвяргі», кожны з якіх прысвечаны адной тэме, а з нядаўняга часу традыцыйнымі сталі і штомесячныя сустрэчы маладых пісьменнікаў і музыкантаў «Кватэрнікі ў дзядзькі Якуба» [2]. Музей Янкі Купалы ў межах акцыі «Вечар у музеі» запрашае наведвальнікаў на канцэрты, музычна-паэтычныя вечарыны і інш. [3]. Значная частка літаратурных вечарын, якія праводзяцца беларускімі музеямі, з'яўляюцца юбілейнымі і прымеркаваны да пэўнай даты ці падзеі.

Зыходзячы з практычнага вопыту, адзначым, што такія мерапрыемствы, як прэзентацыі кніг, творчыя сустрэчы, літаратурныя вечарыны і інш., запатрабаваны даволі вузкай часткай пастаяннай аўдыторыі, а менавіта, як гавораць, «элітарнымі наведвальнікамі», якія характарызуюцца «стабільнай арыентацыяй на музей, высокім узроўнем інфармаванасці, высокай ступенню самастойнасці і незалежнасці меркаванняў і ацэнак у сферы музейнай справы» [5, с.23]. Звычайна гэта прадстаўнікі сфер культуры, адукацыі, інакш – «творчая інтэлігенцыя». Асноўная задача такіх мерапрыемстваў – імідж музея як захавальніка духоўных скарбаў.

Сярод іншых формаў, якія выкарыстоўваюцца ў музейнай рэкрэацыі, з найбольшай цікавасцю сучасныя наведвальнікі ўспрымаюць музейнае свята. Гэта комплексная форма культурна-адукацыйнай дзейнасці, у якой могуць быць аб'яднаны элементы экскурсіі, тэматычнай вечарыны, тэатралізаванага дзейства і інш. Музейнае свята праводзіцца па распрацаваным музейнымі спецыялістамі сцэнарыі, звычайна ўдзел у такіх мерапрыемствах бяруць і творчыя работнікі. Адзначым спецыфічныя асаблівасці, якія маюць масавыя музейныя мерапрыемствы. Па-першае, яны аказваюць вялікае ўздзеянне на эмацыянальную сферу чалавека, што немалаважна ў сучасных умовах інфармацыйных перагрузак. Па-другое, актыўнасць наведвальнікаў, якія непасрэдна ўдзельнічаюць у мерапрыемстве, у тэатралізаваным дзействе і гульні, – гэта абавязковая ўмова такога мерапрыемства. Па-трэцяе, да масавых мерапрыемстваў актыўна далучаюцца творчая інтэлігенцыя, навукоўцы; такім чынам, пашыраецца ўзаемадзеянне музея з іншымі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўстановамі культуры і навукі. Напрыклад, да ўдзелу ў свяце «Ёсць у мяне зямля, край светлых мрояў…», якое адбылося ў рамках юбілейнага праекта ДМГБЛ да 210-годдзя Адама Міцкевіча, былі запрошаны Беларускі паэтычны тэатр аднаго акцёра «Зніч», народныя тэатры імя Уршулі Радзівіл, «На Мышанцы» і «Эксперымент», ваенна-гістарычны клуб «Птах», клуб гістарычнай рэканструкцыі «Шляхецкая застава» [1]. Такія комплексныя мерапрыемствы злучаюць дзве абавязковыя ўмовы – музейнасць і святочнасць.

Як станоўчую тэндэнцыю мы расцэньваем актыўнае далучэнне беларускіх літаратурных музеяў да міжнароднай акцыі «Ноч музеяў», якая праводзіцца штогод і прымеркавана да Міжнароднага дня музеяў. У 2010 г. амаль усе літаратурныя музеі, якія знаходзяцца ў Мінску, падтрымалі гэтую акцыю і падрыхтавалі шэраг цікавых мерапрыемстваў: ДМГБЛ – праграму «Падарожжа па беларускім мястэчку»; Літаратурны музей Максіма Багдановіча (далей – музей Максіма Багдановіча) – свята «Вяселле – NON STOP»; музей Янкі Купалы – праграму «Гарадскі бульвар. Жывая гісторыя»; музей Якуба Коласа – праграму «Святло ў акне». Святочныя праграмы ўключалі прэзентацыі, музычныя нумары, майстар-класы, конкурсы, арт-дзеі, тэатральныя пастаноўкі і інш.

Пры адпаведнай рэкламе масавыя музейныя мерапрыемствы збіраюць значную колькасць гледачоў, якія могуць стаць рэальнай музейнай аўдыторыяй. Напрыклад, вышэйзгаданае свята «Ёсць у мяне зямля, край светлых мрояў…» у Музеі-сядзібе Міцкевічаў «Завоссе» сабрала больш за 1000 гледачоў, сярод якіх былі як мясцовыя жыхары, так і спецыяльна арганізаваныя групы з г. Мінска і г. Баранавічы [1].

Некаторыя музейныя святы становяцца рэгулярнымі. Сярод найбольш паспяховых варта назваць свята паэзіі і песні «Ракуцёўскае лета», якое праводзіцца ў філіяле музея Максіма Багдановіча «Фальварак Ракуцёўшчына», а таксама штогадовае свята паэзіі, працы і песні ў Вязынцы, якое праводзіцца музеем Янкі Купалы разам са сваімі філіяламі ў дзень нараджэння народнага паэта.

Яшчэ адна форма, якая ў апошні час актыўна ўкараняецца ў музейнай дзейнасці, – майстар-класы. Правядзенне майстар-класаў па саломапляценні, выцінанцы, валенні з воўны, вырабе аўтарскіх лялек практыкуецца большасцю беларускіх літаратурных музеяў.

Як адну з адметных асаблівасцей мерапрыемстваў у літаратурных музеях сярод іншых музейных устаноў мы можам назваць непасрэднасць камунікатыўнага ўзаемадзеяння як паміж наведвальнікамі, так і паміж наведвальнікамі і творчымі дзеячамі. Звычайна такія стасункі адбываюцца падчас правядзення літаратурных вечарын, прэзентацый кніг і выстаў, майстар-класаў. На гэтых мерапрыемствах побач са знакамітасцямі бяруць удзел і маладыя творцы, якія маюць магчымасць заявіць аб сабе, што спрыяе творчаму развіццю.

У бліжэйшы час прагназуецца яшчэ большае пашырэнне формаў музейнай рэкрэацыі, сярод якіх, да прыкладу, – стварэнне рэкрэацыйных зон і ўдасканаленне сістэмы абслугоўвання ў музеі. Музейныя кавярні, крамы, дзіцячыя пакоі ўжо даволі працяглы час паспяхова дзейнічаюць у замежных краінах. Асаблівасцю іх рэалізацыі ў музейных сценах з'яўляецца тэматычная накіраванасць, якая звязана з профілем музея. Напрыклад, у музеі магла б дзейнічаць «літаратурная кавярня», інтэр'ер якой афармлены ў адпаведным стылі, дзе наведвальнікам прапаноўваюцца стравы па рэцэптах пісьменнікаў ці апісаныя ў мастацкіх творах.

Безумоўна, удасканальваць існуючыя і знаходзіць новыя формы культурна-адукацыйнай дзейнасці немагчыма без суаднясення з музейнай аўдыторыяй, яе пашырэння. Адзначым, што за апошняе дзесяцігоддзе рэальная аўдыторыя літаратурных музеяў значна павялічылася за кошт малодшых школьнікаў і нават дашкольнікаў. Адбылося гэта ў тым ліку і дзякуючы тэндэнцыі стварэння адрасных праектаў, разлічаных на розныя катэгорыі наведвальнікаў. Гэты кірунак з'яўляецца вельмі перспектыўным, і прагназуецца, што колькасць спецыяльных праграм і выстаў, створаных для пэўнай катэгорыі музейнай аўдыторыі, з улікам яе псіхалагічных і сацыялагічных характарыстык, будзе павялічвацца. А вынікам развіцця дзіцячага кірунку ў экспазіцыйнай і культурна-адукацыйнай дзейнасці ў перспектыве можа стаць стварэнне Дзіцячага літаратурнага музея.

Пашырэнню музейнай аўдыторыі, на наш погляд, можа спрыяць і актыўнае выкарыстанне музеямі ўсіх каналаў перадачы інфармацыі, у тым ліку электроннай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інфармацыйнай прасторы. На сённяназіраюцца першыя спробы стварэння інтэрнэт-старонак і сайтаў літаратурнымі музеямі. Аднак існуе разуменне неабходнасці больш дзейснага выкарыстання дадзенага камунікатыўнага канала. Праз пэўны час магчыма з'яўленне віртуальных літаратурных музеяў; падаецца, што гэта вельмі перспектыўны кірунак дзейнасці. З аднаго боку, ён эфектыўна працуе на далучэнне музейнай аўдыторыі да гісторыка-культурных і літаратурных здабыткаў нацыянальнай і сусветнай культуры. З другога – гэты від дзейнасці не прадугледжвае вялікіх матэрыяльных затрат і адміністрацыйна-гаспадарчых намаганняў і можа з'яўляцца «пробным» этапам перад ажыццяўленнем рэальнага музейнага праекта.

Важным і неабходным кірункам у развіцці культурна-адукацыйнай дзейнасці літаратурнага музея з'яўляецца далучэнне да музейнай аўдыторыі людзей з абмежаванымі магчымасцямі шляхам стварэння спецыялізаваных выстаў і адукацыйных праграм.

Сярод кірункаў музейнай дзейнасці вылучаецца сувязь экспазіцыйнай і культурна-адукацыйнай дзейнасці: значная частка формаў культурна-адукацыйнай дзейнасці рэалізуецца менавіта ў экспазіцыйнай прасторы. Таму змены ў экспазіцыйнай дзейнасці літаратурных музеяў спрыяюць пашырэнню формаў і метадаў працы з наведвальнікамі. У апошні час экспазіцыйная дзейнасць беларускіх літаратурных музеяў становіцца больш разнастайнай, заўважны спробы стварэння дыферэнцыраваных выстаў. У першую чаргу гэта выставы, разлічаныя на дзіцячую аўдыторыю. Са створаных за апошняе дзесяцігоддзе дзіцячых выстаў адзначым выставы «Ад А да Я – з гісторыі буквара», «Планета "Вясёлка"», «Спадарожнікі дзяцінства» ў ДМГБЛ, «Хлопчык і лётчык» у музеі Янкі Купалы. Самі экспазіцыі і экскурсіі па іх уключалі інтэрактыўныя элементы. Напрыклад, на выставе «Ад А да Я – з гісторыі буквара» была створана міні-мадэль «лясной» школы ваеннага часу, дзе дзеці маглі паспрабаваць пісаць на спецыяльнай пясчанай пляцоўцы, якая выкарыстоўвалася замест школьнай дошкі. Напрыканцы экскурсіі на той жа выставе маленькія наведвальнікі маглі пагуляць у вялікую разразную азбуку.

Выстава «Хлопчык і лётчык» умоўна падзялялася на дзве часткі. Адна частка была прысвечана вершу «Хлопчык і лётчык» і перыяду зараджэння авіяцыі. Другая, інтэрактыўная, частка дазваляла наведвальнікам бліжэй пазнаёміцца з прафесіяй лётчыка: можна было прымерыць лётную форму, шлемафон і акуляры, «скокнуць з парашутам» на спецыяльным імітатары. З практычнага вопыту зазначым, што выставы, якія ўключаюць інтэрактыўныя элементы, выклікаюць у наведвальнікаў найбольшы інтарэс, паколькі экскурсанты з'яўляюцца не пасіўнымі гледачамі, а самі бяруць актыўны ўдзел у працэсе здабывання інфармацыі.

Асноўныя тэндэнцыі развіцця, якія праяўляюцца ў дзейнасці літаратур-ных музеяў ужо сёння, а таксама неабходнасць змен у розных кірунках музейнай дзейнасці пацвярджаюць і дадзеныя, атрыманыя ў выніку анкетавання музейных супрацоўнікаў. Анкета была распрацавана аўтарам і распаўсюджана сярод навуковых супрацоўнікаў ДМГБЛ (2005 г.). Трэба адзначыць, што праведзенае апытанне не дае права разглядаць атрыманыя дадзеныя як рэпрэзентатыўныя, паколькі анкетаванне было праведзена сярод навуковых супрацоўнікаў толькі аднаго музея. Тым не менш, на нашу думку, гэтыя звесткі ў пэўнай ступені выяўляюць асноўныя тэндэнцыі ў літаратурным музеязнаўстве, таму што гэты музей у параўнанні з іншымі мае больш шырокую сферу дзейнасці, паколькі займаецца вывучэннем і прэзентацыяй агульналітаратурнага працэсу ў яго гістарычным развіцці. Адказы на пытанні анкеты далі магчымасць высветліць шляхі развіцця літаратурных музеяў з пункту гледжання музейных спецыялістаў.

На думку супрацоўнікаў музея, і праз 10–15 гадоў прыярытэтныя для музея функцыі, такія, як захаванне літаратурнай і гісторыка-культурнай спадчыны, дакументаванне і прэзентацыя гісторыка-літаратурнага працэсу, застануцца нязменнымі. Але тым не менш усе рэспандэнты лічаць, што літаратурны музей не павінен заставацца кансерватыўным арганізмам, а павінен змяняцца ў адпаведнасці з запатрабаваннямі наведвальнікаў. Згодна з прагнозам музейных супрацоўнікаў, у будучым узрасце роля культурна-адукацыйнай, камунікатыўнай і рэкрэацыйнай функцый. Больш за 30% музейшчыкаў лічаць, што паралельна з выкананнем сваіх традыцыйных функцый музей павінен стаць і своеасаблівай рэкрэацыйнай зонай для наведвальнікаў. Паводле меркаванняў музейных супрацоўнікаў, зменіцца і змест экспазіцый. Палова рэспандэнтаў лічаць, што музеі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адмовяцца ад практыкі стварэння ўніверсальных выстаў і экспазіцый, а будуць аддаваць перавагу выставам, разлічаным на пэўную ўзроставую катэгорыю, а таксама на індывідуальных і сямейных наведвальнікаў. Астатнія 50% лічаць, што ўніверсальныя выставы застануцца, але не будуць дамінаваць сярод іншых відаў.

Такім чынам, на сучасным этапе ва ўсіх сферах музейнай дзейнасці, асабліва ў культурна-адукацыйнай, назіраюцца новыя тэндэнцыі. Характэрнай рысай сучаснага развіцця музейнай справы з'яўляецца ўзаемадзеянне і ўзаемаўплыў традыцыйных і новых сучасных формаў музейнай дзейнасці. Традыцыйна ўласцівыя музею функцыі становяцца асновай для рэалізацыі інавацыйных праграм, якія актуальны для сучаснага этапу развіцця музейнай справы. Змены назіраюцца ў розных напрамках музейнай дзейнасці: укараняюцца новыя формы і метады працы з аўдыторыяй, з'явіліся новыя падыходы ў экспазіцыйнай дзейнасці, актыўна распрацоўваюцца пытанні па ўдасканаленні дзейнасці літаратурных музеяў у галіне камунікацыі.

---


1. *Дакументы* па арганізацыі лекцый, выстаў, музейна-педагагічных заняткаў (2003–2010). – Матэрыялы Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры.

2. *Дзяржаўны* літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа [Электронны рэсурс]. – 2009. – Рэжым доступу: http://yakubkolas.by. – Дата доступу: 04.03.2010.

3. *Дзяржаўны* літаратурны музей Янкі Купалы [Электронны рэсурс]. – 2011. – Рэжым доступу: http://kupala-museum.by/. – Дата доступу: 25.01.2011.

4. *Дзяржаўны* музей гісторыі беларускай літаратуры [Электронны рэсурс] / Міністэрства культуры Рэсп. Беларусь. – 2010. – Рэжым доступу: http://www.musey.moy.su. – Дата доступу: 21.01.2011.

5. *Комплекснае* сацыялагічнае даследаванне работы музеяў Беларусі з аўдыторыяй // Аператыўная інфармацыя па праблемах культуры і мастацтва: навук.-інфарм. зб. / Нац. б-ка Беларусі. – Мінск, 2000. – Вып. 1. – 108 с.

6. *Музеи* // Культура Республики Беларусь: стат. сб. / Нац. стат. комитет Респ. Беларусь; редкол.: Е. И. Кухаревич (пред.) [и др.]. – Минск, 2009. – С. 79–90.



*I. LUPASHKO*


## MAJOR TRENDS IN CULTURAL AND EDUCATIONAL ACTIVITIES OF THE BELARUSIAN LITERARY MUSEUMS IN THE MODERN PERIOD


Major trends in the museum activities are determined on the basis of the real-life work of the Belarusian literary museums' analysis and the results of the questionnaire surveys conducted among the museum personnel. Main focus is drawn to the changes in cultural, educational and exhibition activities of literary museums; influence of modern information technologies on the development of certain aspects in museum activities is also depicted.



Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 15.03.2011.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ